# Этапы кананічнага працэсу аб сцвярджэнні нядзейснасці сужэнства
## (спрошчана)

1. Унясенне пазоўнай заявы (згодна з узорам)
2. Прыняцце ці непрыняцце заявы, у якой павінныя быць пазначаныя актуальныя адрасы пражывання і тэлефоны бакоў працэсу і сведкаў. Калі заява прынята, бакам працэсу прапаноўваюць юрыдычнае акрэсленне прычыны нядзейснасці сужэнства. Адказчыку пры гэтым высылаецца копія пазоўнай (іскавой) заявы. На гэтым этапе вызначаецца абаронца сужэнскай повязі – асоба, якая будзе шукаць доказы таго, што сужэнства дзейснае.
3. Калі адказчык (-ца) двойчы не адказвае на выклік суда, то працэс вядзецца без яго (яе) ўдзелу. Адсутнасць адказчыка (-цы) часамі не дазваляе даказаць нядзейснасць сужэнства, бо доказны матэрыял можа быць няпоўны і неаб’ектыўны.
4. Калі бакі выразяць пісьмова сваё меркаванне адносна прапанаванай юрыдычнай падставы нядзейснасці, усталёўваецца прадмет судовай спрэчкі, вызначаецца тып працэсу (звычайны ці дакументальны) і вызначаецца склад судзейскай калегіі (асобы, якія будуць прымаць рашэнне ў справе).
5. Выклік пазоўніка (-цы)/ісца для дачы паказанняў. Звычайна ў дзень дачы паказанняў пазоўнік складае ахвяраванне на патрэбы суда Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі.
6. Выклік адказчыка (-цы) для дачы паказанняў.
7. Выклік сведкаў для дачы паказанняў (паасобку). Сведкаў вызначаюць пазоўнік і адказчык.
8. Пры неабходнасці: заключэнне псіхолага-эксперта, якое робіцца на падставе матэрыялаў справы або асабістай сустрэчы з пазоўнікам/адказчыкам.
9. Публікацыя (абвяшчэнне актаў): пазоўнік і адказчык паасобку могуць прыйсці і азнаёміцца з сабранымі доказнымі матэрыяламі (пераважна з пратаколамі праслухоўванняў). Можна дадаць новыя доказы, напрыклад, яшчэ аднаго сведку, ці дакумент і пісьмова пракаментаваць прачытанае так, каб падмацаваць думку аб дзейснасці ці нядзейснасці сужэнства.
10. Акты справы перадаюцца Абаронцы сужэнскай повязі. Абаронца сужэнскай повязі піша Меркаванне (заўвагі), ў якім прадстаўляе тое, што сведчыць аб дзейснасці сужэнства. Бакі атрымліваюць копію гэтага Меркавання і могуць яго пісьмова пракаментаваць.
11. Азнаямленне суддзяў з актамі справы і абмеркаванне яе падчас судзейскай сесіі.
12. Вынясенне прысуду (копію бакі атрымліваюць па пошце).
13. Магчымасць апеляцыі ў суд у г.Гродна. Калі апеляцыя не ўнесена ў адпаведныя тэрміны, то прысуд уступае ў сілу, пра што бакі паведамляюцца асобным дэкрэтам.

Унясенне справы ў суд не азначае аўтаматычна, што сужэнства будзе прызнана нядзейсным. Пазоўнік мае абавязак даказаць нядзейснасць сужэнства. Працэс дастаткова працяглы. Бакі павінны забяспечыць яўку сведкаў і папрасіць іх аб супрацоўніцтве з судом. Распад сям’і не з’яўляецца доказам нядзейснасці сужэнства. У дзяржаўным заканадаўстве таксама існуюць два розныя віды працэсаў: аб разводах і прызнанне нядзейснасці (напрыклад, пры фіктыўных сужэнствах). Разводаў у Касцёле няма.

У працэсе жанчына (пазоўніца ці адказчыца) заўсёды фігуруе пад дзявочым прозвішчам.